# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

6 студзеня 2022 г. № 5 г.Мінск

Аб прысуджэнні прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае захаванню і памнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцей і ідэй міласэрнасці, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2021 года:

грамадскаму аб'яднанню ”Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб ”Віккру“ – за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі, увекавечванне памяці абаронцаў Айчыны, рэалізацыю разведвальных пошукавых праектаў ”Памяць“, ”Дняпроўскі рубеж“ і ”Сожскі рубеж“ на Магілёўшчыне;

калектыву дзяржаўнай установы адукацыі ”Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г.Брэста“ – за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі, рэалізацыю праекта ”Пост Памяці Брэсцкай крэпасці“, актыўны ўдзел у міжнародным міратворчым руху;

Мясцоваму дабрачыннаму фонду імя Аляксея Талая – за асаблівыя заслугі ва ўвасабленні ідэй гуманізму, рэалізацыю дабрачынных праектаў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці і традыцый, падтрымку дзяцей, якія пацярпелі ад ваенных дзеянняў;

протаіерэю Кірылу Уладзіміравічу Шолкаву, настаяцелю храма іконы Божай Маці ”Усецарыца“ ў г.Мінску, старшыні Сінадальнага аддзела па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні Беларускай Праваслаўнай Царквы, – за вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне духоўных каштоўнасцей, самаадданую працу ў галіне асветніцтва і царкоўнай дабрачыннасці;

Рэспубліканскаму грамадскаму аб'яднанню ”Патрыёты Беларусі“ – за рэалізацыю сацыяльна значных праектаў, накіраваных на фарміраванне грамадзянскай самасвядомасці і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2021 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

10